

# Слава і гонар сталічнай зямлі

**У Беларусі вядзецца актыўная работа па аднаўленні, зберажэнні і папулярызацыі нацыянальнай спадчыны. Распрацоўваюцца комплексы мерапрыемстваў для падтрымання належнага тэхнічнага стану гісторыка-культурных помнікаў, прыстасавання іх пад сучасныя задачы, уключэння ў турыстычны і культурны абарот. І, вядома, узводзяцца новыя аб'екты. Да прыкладу, у сталіцы...**



## ЗГОДНА З УКАЗАМ

Кіраўнік дзяржавы 5 лютага падпісаў указ №50, якім прадугледжваецца будаўніцтва ў 2025—2027 гадах у Мінску Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі, парку Народнага адзінства і стварэнне пастаяннай экспазіцыі. Аб'екту нададзены статус Усебеларускай маладзёжнай будоўлі, удзел у якой возьмуць юнакі і дзяўчаты ва ўзросце да 31 года, у тым ліку ў складзе студэнцкіх атрадаў. Як паведаміў на прэс-канферэнцыі 6 лютага дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Вадзім Лакіза, новы музей праектуецца ў выглядзе карты Беларусі. Яго плошча складзе каля 20 тысяч квадратных метраў. У экспазіцыі плануецца адлюстраваць усе этапы гісторыі краіны. Наведвальнікі змогуць скарыстацца QR-кодамі, больш падрабязна пазнаёміцца з інтэрактыўнымі элементамі — будуць выкарыстаныя ўсе сучасныя тэхналогіі.



◄ Царква Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў Маладзечне

## МУЗЕЙ НА МЕНЦЫ

Сярод задумак, аб якіх распавёў Вадзім Лакіза, і распрацаваная папярэдняя архітэктурна-планіровачная канцэпцыя археалагічнага музея пад адкрытым небам, які можа быць створаны ў Гарадзішчы на рацэ Менцы. Даследаванне гэтага археалагічнага комплексу — найбуйнейшы нацыянальны праект у рамках зацверджанай урадам канцэпцыі фарміравання найбольш значных нацыянальных археалагічных праектаў на 2023—2030 гады. Летась тут пад кіраўніцтвам навукоўцаў папрацавалі на практыцы паўтысячы студэнтаў-валанцёраў з сямнаццаці ВНУ.

У выніку раскопак упершыню даказана існаванне абарончай сцяны старажытнага горада X—XI стагоддзяў вышынёй 5—6 метраў з дубовымі канструкцыямі, якія знаходзяцца ў арганізацыі, што займаецца іх кансервацыяй. Сёння ў Нацыянальнай акадэміі навук ствараецца лабараторыя па кансервацыі і рэстаўрацыі археалагічных і гісторыка-культурных прадметаў, куды могуць звяртацца музеі, каб атрымаць кансультацыю і правесці рэстаўрацыю вырабаў з жалеза і каляровых металаў.

## НОВАЕ ЖЫЦЦЁ ПОМНІКАЎ

Агулам у сталіцы праводзіліся рамонтна-рэстаўрацыйныя работы на 104 аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны, з гэтага ліку на 90 яны завершаныя. Аб гэтым распавяла начальнік аддзела мастацтваў упраўлення культуры Мінгарвыканкама Наталля Вярэніч. Таксама існуе план па захаванні аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны з пакрокавымі дзеяннямі па кожным аб'екце, які не выкарыстоўваецца. У спіс уваходзяць сядзібна-паркавы комплекс у Лошыцы, архітэктурны комплекс "Замак Пішчалы", комплекс будынкаў чыгуначнай бальніцы з воданапорнай вежай па вуліцы Аўтадараўскай, 3А.

Каля 90% складае гатоўнасць будынка Белгідрамету па праспекце Незалежнасці, 110, праз пару месяцаў ён будзе ўведзены ў гаспадарчы абарот. Вядуцца работы ў комплексе вытворчых пабудоў на вуліцы Краснай, 23, на Кальварыйскіх могілках і ў гістарычным цэнтры сталіцы — на Ракаўскай, 18. На гэтыя рамонтныя работы затрачаныя як уласныя сродкі ў аб'ёме больш за 6 мільёнаў 749 тысяч рублёў, так і сродкі мясцовага бюджэту — больш за 3,5 мільёнаў і каля 2 мільёнаў 671 тысячы з рэспубліканскага бюджэту.

## АГЛЯДЫ І ЭКСКУРСІІ

У дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі ўключана 505 аб'ектаў, размешчаных на тэрыторыі горада Мінска, у тым ліку два помнікі горадабудаўніцтва, 328 — архітэктуры, 6 — археалогіі, 18 — гісторыі, 31 — мастацтва. Да таго ж 67 рухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей

▲ Раскопкі гарадзішча на Менцы



Рэшткі старажытных пабудоў на гарадзішчы ►



▲ Воданапорная вежа на Аўтадораўскай вуліцы

▼ Царква прападобнай Марыі Егіпецкай у Вілейцы

і 53 нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці.

У 2024 годзе пастановай Міністэрства культуры статус гісторыка-культурнай каштоўнасці быў нададзены часткі будынка па праспекце Незалежнасці, 27А, у межах гістарычнага аб'ёму канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Летась адказнымі за ахову гісторыка-культурнай спадчыны было здзейснена 69 аглядаў аб'ектаў, якія збольшага звязаны з заменай кандыцыянераў, аконных і дзвярных блокаў. Таксама пры кожнай адміністрацыі раёнаў горада Мінска ў аддзеле архітэктуры ёсць схемы і гістарычныя даведкі, паводле якіх мусіць адбывацца ўся замена элементаў аб'ектаў гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Па даручэнні Мінгарвыканкама супрацоўнікі Музея гісторыі горада Мінска распрацавалі пяць пешаходных экскурсійных маршрутаў па гістарычным цэнтры сталіцы. Гэта "Гісторыя Верхняга горада праз прызму часу" з наведваннем падвалаў былой царквы Святога Духа, "Спадчына старога горада: вуліца Кірылы і Мяфодзія і вуліца Герцэна", "Спадчына старога горада: плошча Свабоды і вуліца Ракаўская", "Шлях Перамогі па вуліцах Мінска" і "Старонкі каменнага летапісу Верхняга горада".

## У СЭРЦЫ КРАІНЫ

Вялікая праца ў гэтым кірунку вядзецца і ў цэнтральным рэгіёне. Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення культуры Мінаблвыканкама Таццяна Хмель распавяла, што ў Мінскай вобласці налічваецца 693 гісторыка-культурныя каштоўнасці. Міншчына ганарыцца сваімі аб'ектамі гісторыка-культурнай спадчыны, сярод якіх палацава-паркавы ансамбль у Нясвіжы, комплекс былога кляштара бернардынцаў у Будславе Мядзельскага раёна, палацава-паркавыя ансамблі ў Станькаве і Прылуках, звязаныя з гісторыяй роду Чапскіх, касцёл святога Юзафа і палацава-паркавы ансамбль у Валожыне, звязаны з родам Тышкевічаў, мемарыяльныя комплексы "Курган Славы" і "Хатынь".

За апошнія два гады ў гэты спіс дадалося 11 аб'ектаў, сярод якіх можна адзначыць царкву прападобнай Марыі Егіпецкай у Вілейцы, царкву Покрыва Прасвятой Багародзіцы ў Маладзечне, царкву ў Васільчыцах Капыльскага раёна, а таксама сядзібу Свентаржэцкіх у Маладзечанскім раёне і сядзібны дом Макавых у Мар'інай Горцы. Сёння ў вобласці падрыхтаваны ўжо 141 праект зон аховы, у тым ліку 36 праектаў летась. У план на 2022—2025 гады па захаванні аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны Міншчыны трапіла 56 аб'ектаў.

Летась у гаспадарчы абарот уведзеная ешыва ў Валожыне, сёння ў адрэстаўраваным будынку знаходзіцца музейная экспазіцыя. У цэлым за 2024 год на рамонтна-рэстаўрацыйныя работы на аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны вобласці ўкладзена каля 17 мільёнаў рублёў. Таксама ўведзены ў турыстычнае абарачэнне ансамбль былой сядзібы XIX стагоддзя графаў фон Гутэн-Чапскіх у вёсцы Станькава Дзяржынскага раёна, а фрагменты комплексу былой сядзібы ў аграгарадку Туча Клецкага раёна ўключаныя ў турыстычны маршрут "Па слядах гісторыі Клеччыны".

## СКАРБЫ МІНШЧЫНЫ

У вобласці 19 супрацоўнікаў музеяў атэставаныя і працуюць па 15 маршрутах. Папулярызуюцца брэндавыя мерапрыемствы і звычаі, сярод якіх абрад пераносу Міхайлаўскай свячы ў Барысаўскім раёне, абрадавая гульня "Цягнуць Каляду на дуба" ў Бярэзінскім раёне, народнае абрадавае ігрышча "Ката пячы", калядны абрад "Шчадрэц", традыцыйны народны абрад "Калядныя цары" ў Семежаве Капыльскага раёна, Будслаўскі фэст у Мядзельскім раёне.

Правядзенне ў Беларусі ў 2025-м Года добраўпарадкавання, ставіць у тым ліку задачы ўзмацнення ўвагі да пытанняў гісторыка-культурнай спадчыны. Сёлета будуць праводзіцца работы на сядзібным доме графа Патоцкага XIX стагоддзя ў Беразіне. Святкаванне 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне будзе адзначана не толькі шэрагам абласных і рэгіянальных мерапрыемстваў, але і прыняццем мер па рамонце і прывядзенні ў належны стан тэрыторый мемарыяльных комплексаў. Сёння працягваюцца рамонтна-рэстаўрацыйныя работы на мемарыяльным комплексе "Курган Славы" — ужо ў гэтым годзе плануецца адрэстаўраваць пояс з мазаікай і лесвіцу, якая вядзе на вяршыню помніка.

**Антон РУДАК**





Сядзіба Макавых у Мар'інай Горцы